■ Чацвёртая ўлада

# РАСКАЗВАЦЬ АБ СТАНОЎЧЫМ ВОПЫЦЕ І РАЗБІРАЦЦА Ў ПРАБЛЕМНЫХ ПЫТАННЯХ

## Місію журналістыкі абмеркавалі на рэспубліканскім семінары ў Гродне

**Каля 200 журналістаў з усіх абласцей сабраў учора на Гродзеншчыне рэспубліканскі семінар «Аб рабоце СМІ па рэалізацыі задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі». Яны пазнаёміліся з творчымі напрацоўкамі «Гродзенскай праўды», Лідскага тэлерадыёаб'яднання, ваўкавыскай газеты «Наш час», медыякомплексу Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, пабывалі на шэрагу прадпрыемстваў, арганізацый вытворчай і сацыяльнай сферы, паўдзельнічалі ў запуску на тэлеканале «Гродна плюс» вяшчання ў HD-фармаце на пастаяннай аснове.**

Міністр інфармацыі Лілія **АНАНІЧ** падкрэсліла знакавасць таго, што семінар праходзіць у кантэксце нядаўняга Усебеларускага народнага сходу і напярэдадні выбараў у парламент:

— Важна, каб тыя пасылы, задачы, якія пастаўлены Усебеларускім народным сходам, трансфармаваліся на старонках газет, у эфіры тэлерадыёканалаў, на інтэрнэт-рэсурсах, на растлумачэнне дзяржаўнай палітыкі. Бо самае галоўнае — гэта фарміраванне адказных адносін грамадзян да сябе, сваёй сям'і, краіны.

Што тычыцца выбараў у парламент, то трэба ўважліва і вельмі адказна кіравацца патрабаваннямі выбарчага заканадаўства.

— Упэўнена ў тым, што СМІ у поўным аб'ёме выканаюць сваю задачу па ўсебаковым, аб'ектыўным інфармаванні аб выбарчым працэсе, каб грамадзяне мелі магчымасць азнаёміцца з праграмамі кандыдатаў у дэпутаты і зрабілі дастойны выбар, — дадала міністр.

Лілія Ананіч пакрэсліла, што задача медыйнай сферы ва ўмовах канкурэнцыі — узмацняць стварэнне нацыянальнага кантэнту, бо ніхто лепш за нас саміх не раскажа пра тое, што адбываецца ў нашай краіне. Вельмі шмат добрых тэм, праектаў, якія патрабуюць пільнай увагі журналістаў, напрыклад пытанні здароўя ладу жыцця. Канешне, у цэнтры ўвагі прэсы павінны заставацца важнейшыя праблемы развіцця эканомікі, сацыяльнай палітыкі. Пры гэтым, расказваючы аб станоўчым вопыце, які маецца ў кожным рэгіёне, трэба бачыць і не ўтойваць вострыя тэмы, якія хвалююць насельніцтва, і разам з чытачамі, уладай разбірацца ў праблемных пытаннях. Тым больш што толькі ў нашай краіне ёсць указ Прэзідэнта аб рэагаванні на крытычныя выступленні ў СМІ.

Лілія Ананіч таксама звярнула ўвагу на ўдасканаленне работы ў інтэрнэце. Інтэрнэт-сайты створаны, але трэба, каб гэтыя рэсурсы былі запатрабаваны чытачамі. Неабходна больш актыўна працаваць у сацыяльных сетках, з парталам «БелСМІ».

— Моцна трымацца на лідарскіх пазіцыях сёння, у эпоху хуткага развіцця новых тэхналогій, можа толькі добра аснашчаная і забяспечаная высокапрафесійнымі кадрамі рэдакцыя сродку масавай інфармацыі, — лічыць **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.**



Фота БЕЛТА.

**Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.**

У мінулай пяцігодцы на Гродзеншчыне рэалізавалі абласную Комплексную праграму развіцця сродкаў масавай інфармацыі, дзякуючы якой значна ўмацавалі матэрыяльную базу рэдакцый газет і друкарняў. А дзеля эфектыўнага выкарыстання творчага патэнцыялу нядаўна стварылі рэгіянальны кластар друкаваных СМІ, у які ўвайшлі рэдакцыі «Гродзенскай праўды», раённых газет, абласное аддзяленне Беларускага саюза журналістаў, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы і галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама. У рамках гэтай медыйнай структуры ладзяць творчыя семінары, трэнінгі, арганізавалі конкурс інавацыйных праектаў студэнтаў і маладых спецыялістаў у сферы медыякамунікацый.

Безумоўным прыярытэтам сёння з'яўляецца і якасная работа ў інтэрнэце. Віктар Лісковіч паведаміў, што ў рэгіёне ствараюць свайго роду вертыкаль дзяржаўных электронных рэсурсаў, якая ўключае сайты прадпрыемстваў і арганізацый, СМІ, органаў улады. Інфармацыя распаўсюджваецца ад сайтаў выканкамаў да самых невялікіх прадпрыемстваў, і, наадварот, навіны з месцаў аператыўна даходзяць да буйных інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсаў. Пры гэтым з'явіліся клікабельныя банеры рознай тэматыкі. Любы наведвальнік сайта сёння абавязкова ўбачыць блок навін, можа адкрыць банеры «Выбары-2016», «Год культуры», «Гродзенская вобласць. Каляндар падзей — 2016», «Легенды Гродзеншчыны», а таксама тыя, якія падкажуць, як актыўна і з карысцю правесці вольны час, — «Веларух», «Каробчыцкі «Алімп», «Турыстычная прывабнасць Гродзеншчыны», «Аўгустоўскі канал запрашае».

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

**У тэму:**

**Сяргей РАЎНЕЙКА, памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Гродзенскай вобласці:**

— Думаю, што СМІ маюць важнейшае значэнне ў сістэме дзяржаўнага кіравання, паколькі гэта, па-першае, вельмі дзейсны сродак уплыву, а па-другое, эфектыўны канал данясення аператыўнай інфармацыі. Хацелася б, каб СМІ былі ў рэгіёне дыскусійнай пляцоўкай, дзе ўзнімаюцца надзённыя пытанні і даецца магчымасць выказацца ўсім слаям насельніцтва, у тым ліку аказваючы ўплыў на прынятыя рашэнні ўладамі.

# НА ВАРЦЕ ФІНАНСАВАЙ БЯСПЕКІ



**У апошнія гады органы фінансавых расследаванняў дзяржаўнага кантролю (ОФР) займаліся процідзеяннем ілжэпрадпрымальніцтву, ухіленню ад выплаты падаткаў, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама крымінальнаму банкруцтву. Так, у першым паўгоддзі сёлета ОФР выявілі каля тысячы злачынстваў, з іх больш за траціну адносяцца да катэгорыі цяжкіх. Акрамя таго, аператыўнікі спынілі дзейнасць 11 злачынных груп. У выніку дзеянняў фінансавай міліцыі ў бюджэт паступіла 989 мільярдаў недэнамінаваных рублёў.**

## На асаблівых падставах

«Фактычна ўсе праверкі органаў КДК — выніковыя,— адзначыў падчас брыфінгу ў прэс-цэнтры БЕЛТА **намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў Ігар МАРШАЛАЎ**. — На кожны рубель, запланаваны на фінансаванне ОФР у 2016 годзе, ужо па выніках першага паўгоддзя забяспечана паступленне ў бюджэт больш чым 7 рублёў». Пры гэтым удзельная вага праверак, якія праводзяцца ўсімі падраздзяленнямі КДК, складае ўсяго 1,5% ад агульнай колькасці планавых і пазапланавых праверак, якія праводзяцца па краіне ўсімі астатнімі кантрольнымі і наглядными органамі. Адсюль высноваа — ОФР працуюць толькі кропкава, калі маюць на тое асаблівыя падставы.

## Выпраўленне крэдытнай гісторыі

Па словах Ігара Маршалава, у сферы пагашэння крэдыторскай запазычанасці адзначаецца пагаршэнне крымінальнай абстаноўкі. У першым паўгоддзі ўзрасла больш чым у два разы, у параўнанні з аналагічным перыядам летась, колькасць выяўленых злачынстваў па фактах ухілення ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці, а таксама ад выканання судовых пастаноў па эканамічных справах. За першае паўгоддзе ОФР выявілі больш за 300 парушэнняў, звязаных з выплатай даўгоў, уключаючы 173 злачынствы па ўхіленні ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці. Таксама Ігар Маршалаў адзначыў, што расце і колькасць злачынстваў, звязаных з атрыманнем крэдытаў.

## Лекі ад ілжэпрадпрымальніцтва

Супрацьдзеянне лжэпрадпрымальніцтву застаецца ў ліку галоўных прыярытэтаў дзейнасці ОФР. Так, у першым паўгоддзі спынена дзейнасць сямі злачынных груп, якія арганізавалі рэгістрацыю і функцыянаванне 308 ілжэструктур, а таксама выяўлена 230 злачынстваў, учыненых з іх выкарыстаннем. Па артыкуле 234 (ілжэпрадпрымальніцтва) Крымінальнага кодэкса выяўлена 18 правапарушэнняў. Такім структурам і іх контрагентам прад'яўлена да выплаты дадатковых плацяжоў на агульную суму ў 961 мільярд рублёў без уліку дэнамінацыі, з якіх у бюджэт спагнана 753 мільярды рублёў.

«Апошнія затрыманні сведчаць аб тым, што лжэструктуры ў асноўным рэгіструюцца за межамі Беларусі. У выніку іх кліенты нясуць дадатковыя выдаткі, што не кожны бізнес можа сабе дазволіць. Часам прасцей заплаціць у бюджэт падаткі, чым губляць сродкі потым, — сказаў Ігар Маршалаў. — Разам з тым у буйных ілжэструктур выяўляецца да 1 тысячы контрагентаў, што сведчыць пра тое, што гэта злачынная з'ява існуе, хоць і не ў такіх маштабах, як раней».

Рэгістрацыя лжэструктур за межамі краіны некалькі ўскладняе працэс дакументавання, але дзякуючы міжнароднаму супрацоўніцтву ОФР распяхова дамагаюцца пэўных вынікаў.

Разам з тым, па словах **начальніка аддзела прававога забеспячэння, інфармацыі і работы са зваротамі грамадзян Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Мікалая ІВАНЬКОВА**, контрагенты лжэструктур за тры месяцы добраахвотна заплацілі па прадпісаннях ОФР 330 млн рублёў без уліку дэнамінацыі. Ужо вынесены заключэнні ў дачыненні да 25 такіх структур. Па выніках завершаных да 1 жніўня праверачных мерапрыемстваў вынесена 95 прадпісанняў, а таксама праведзена 86 праверак фінансава-гаспадарчай дзейнасці выяўленых контрагентаў, звесткі ў дачыненні да 15 контрагентаў накіраваны ў падатковыя органы.

Эфектыўным інструментам у барацьбе з ілжэпрадпрымальніцтвам стаў Указ №14 «Аб дадатковых мерах па папярэджанні незаконнай мінімізацыі сум падаткаў». Ён накіраваны на зніжэнне колькасці праверак і стварэнне такіх умоў, калі кліентам ілжэструктур будзе нявыгадна працаваць з фірмамі-аднадзёнкамі.

Указ таксама стымулюе рэальны сектар эканомікі добраахвотна выплачваць у бюджэт падаткі па гаспадарчых аперацыях, якія ажыццяўляліся з ілжэструктурамі, не чакаючы, калі да іх прыйдуць органы фінансавых расследаванняў альбо падатковыя органы. «Калі суб'ект гаспадарання добраахвотна выплачвае неабходныя сумы, ён вызваляецца ад адміністрацыйнай адказнасці. Калі ж гэта ўмова не выконваецца, то яму прыйдзецца не толькі выплаціць падаткі, але і панесці адказнасць», — растлумачыў Мікалай Іванькоў. Інфармацыю пра лжэструктуры, у дачыненні да якіх Дэпартамент фінансавых расследаванняў склаў заключэнне, планауецца размяшчаць на афіцыйнай старонцы Камітэта дзяржкантролю ў інтэрнэце.

Акрамя таго, па словах Ігара Маршалава, у Беларусі плануецца павялічыць мінімальны памер шкоды, неабходнай для прыцягнення да крымінальнай адказнасці за ўхіленне ад выплаты падаткаў. Цяпер злачынствам з'яўляецца ўхіленне ад выплаты падаткаў, збораў на суму больш за 1 тысячу базавых велічынь. Адпаведны праект закона знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі. Дакладны парог шкоды пакуль невядомы.

## Крымінальнае банкруцтва па-беларуску

ОФР надаюць асаблівую ўвагу праблеме неплацежаздольнасці і банкруцтва. Так, у сферы крымінальнага банкруцтва ў першым паўгоддзі сёлета супрацоўнікі ОФР выявілі 16 злачынстваў. «Калі ва ўсім свеце інструменты банкруцтва выкарыстоўваюцца ў мэтах пераадолення... перазагрузкі бізнесу, то ў Беларусі таксама і для ўхілення ад выплаты даўгоў, у тым ліку перад дзяржавай. Праблема вельмі сур'ёзная. Сумесна з Міністэрствам эканомікі, іншымі зацікаўленымі органамі і навукоўцамі праводзім семінары, абмяркоўваем шляхі процідзеяння гэтай крымінальнай з'яве. У хуткім часе, я думаю, па гэтым пытанні будзе наведзены парадак», — лічыць Ігар Маршалаў. Таксама ён не выключае карэкціроўкі адпаведнага заканадаўства. Такая мера пры гэтым не з'яўляецца экстраннай, а будзе праведзена згодна з планам.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** Kryzhevich@zviazda.by

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

• Раздел и установление порядка пользования земельным участком
• Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
• Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
• Оценка всех видов собственности

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», 8 (0232) 29 51 12**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (складское помещение) с инвентарным номером 350/D-271000, площадью 207,1 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Севастопольская, 143А-6. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами. | **55 000 руб. 00 коп. (в денежных знаках образца 2000 года 550 000 000)** | **5 500 руб. 00 коп. (в денежных знаках образца 2000 года 55 000 000)** |
| **Информация о земельном участке** | Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006226 площадью 0,2249 га (договор аренды земельного участка от 23.01.2013 г.) | | |
| **Срок подачи заявления** | **По 25 августа 2016 г. в рабочие дни с $9^{00}$ до $16^{00}$ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** | | |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **29 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266 Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация» | | |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 6 (шесть) месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. | | |

**Подробная информация в газете «Звязда» от 16.06.2016 г. и по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341-15-45.**